можности для персонального обучения, интерактивных занятий и коллективного преподавания. Внедрение облачных технологий не только снизит затраты на приобретение необходимого программного обеспечения, но и повысит качество и эффективность образовательного процесса, подготовит студентов к жизни в современном информационном обществе, поможет качественно и оперативно организовать методическую работу преподавателя.

УДК 821.161.3.09

## КРЭАТЫЎНЫ І ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ВЫВУЧЭННЯ БІЯГРАФІЧНАЙ ПРОЗЫ Ў ТЭХНІЧНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

*А. У. ЯРМОЛЕНКА*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, г. Гомель*

Развіццё сацыяльна, духоўна і маральна дасканалай крэатыўнай асобы прадугледжвае выкарыстанне найбольш эфектыўных падыходаў для паляпшэння сацыяльна-асобасных і метапрадметных кампетэнцый студэнтаў з мэтай іх пад’ёму на больш высокую ступень пазнання і творчай эвалюцыі. Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 82 ад 15 ліпеня 2015 года [1], патрабаванні тыпавой вучэбнай праграмы па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» [2] у тэхнічным універсітэце прадугледжваюць выхаванне грамадзянскай адказнасці і патрыятызму, што магчыма, у прыватнасці, з дапамогай выкарыстання біяграфічнай прозы беларускіх пісьменнікаў.

Выкарыстанне біяграфічных звестак з жыцця класікаў беларускай літаратуры, біяграфічных і аўтабіяграфічных твораў, іх лінгвістычнага і дыдактычнага патэнцыялу садзейнічае інтэграцыі моўнага і індывідуальнага падыходаў да зместу адукацыі, які павінен адпавядаць патрабаванням сучаснага грамадства. Біяграфічныя тэксты, у прыватнасці прысвечаныя жыццю і дзейнасці беларускіх пісьменнікаў, інжынераў, архітэктараў і інш., ілюструюць механізмы фарміравання і развіцця асобы чалавека. Характар і свядомасць такога чалавека раскрываюцца ў жыццёвых выпрабаваннях (Першая сусветная і Вялікая Айчынная войны, рэвалюцыя, калектывізацыя, індустрыялізацыя).

Наяўнасць вялікага аб’ёму імпліцытнай выхаваўчай інфармацыі з’яўляецца найбольш каштоўнай якасцю біяграфіі. Вывучэнне асобы беларускага спецыяліста-прафесіянала ў кантэксце прасторы і часу, сацыяльнага асяроддзя дае багаты матэрыял для самарэфлексіі, усведамлення маладым чалавекам свайго месца і ролі ў гісторыі. Узорам стварэння аксіялагічнай мадэлі паводзін для паслядоўнага самаўдасканалення чалавека можа служыць жыццё і творчасць Максіма Іванавіча Гарэцкага – пісьменніка, філосафа, грамадскага дзеяча, чарцёжніка (скончыў Горы-Горацкае каморніцкае вучылішча), каморніка (землямера) землеўпарадкавальных камісій. Асноўнай ідэяй грамадскай і творчай дзейнасці Максіма Гарэцкага з’яўляецца самаразвіццё і самарэалізацыя чалавека.

Аўтабіяграфічны, наватарскі тып героя, створаны пісьменнікам для таго, каб выказаць свае думкі, пачуцці і перажыванні, прадстаўлены як у апавяданнях пісьменніка: «У лазні» (1913), «Роднае карэнне» (1913), «У чым яго крыўда?» (1914), так і ў аповесцях «У чым яго крыўда?» (1925–1926), «Меланхолія» (1916–1921, 1928), «На імперыялістычнай вайне» (1926). Герой пісьменніка шмат працуе над уласнай адукацыяй і выхаваннем, пераадольваючы маральныя і матэрыяльныя цяжкасці, каб вучыцца і працаваць на карысць роднай краіны. Лёс інтэлігенцыі пачатку ХХ стагоддзя, даваеннае і ваеннае становішча беларускай вёскі пададзены ў апавяданнях і аповесцях Максіма Гарэцкага праз аналіз жыццёвага шляху аўтабіяграфічнага героя. Духоўныя перажыванні галоўнага героя дапамагаюць чытачу не толькі даведацца пра мінулае, але і пера-жываць разам з персанажам, фарміраваць погляды, характар, выхоўваць імкненне да дабра і справядлівасці.

Празаічныя творы Максіма Гарэцкага ствараюць такі яскравы малюнак, што выявы і вобразы выклікаюць зваротныя эмоцыі, садзейнічаюць глыбокаму самааналізу, развіццю самасвядомасці. Сіла мастацкага слова аказвае маральнае, эстэтычнае і выхаваўчае ўздзеянне на асобу, становўча ўплывае на розум і пачуцці, узбагачае ўнутраны свет. Узнятыя пісьменнікам пытанні безумоўна ўплываюць на сучаснае станаўленне і фарміраванне асобы і грамадства. Створаны Максімам Гарэцкім вобраз маладога інтэлігента, які ўласнае жыццё прысвячае служэнню Радзіме і барацьбе за шчаслівую долю беларускага народа, можа служыць яскравым прыкладам для падрастаючага пакалення. Выпрабаванні, якія выпалі на долю героя-інтэлігента, прымушаюць задумацца над

уласным лёсам, цвяроза ацаніць падрыхтоўку да самастойнага жыцця і працы, вызначыць прыярытэтныя напрамкі самаразвіцця.

Творчасць Івана Пятровіча Шамякіна – пісьменніка, грамадскага дзеяча, акадэміка НАН Беларусі, які скончыў Гомельскі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў, прысвечана апісанню жыцця і прафесійнай дзейнасці прадстаўнікоў многіх спецыяльнасцей. Адным з першых у беларускай літаратуры ён звяртаецца да адлюстравання працы і службовых абавязкаў архітэктара. Герой рамана Івана Шамякіна «Атланты і карыятыды» (1974) працуе галоўным архітэктарам беларускага абласнога цэнтра (магчыма, Гомеля), выкладае архітэктуру ў тэхнічным універсітэце. Вось як ацэньвае героя твора дачка Івана Шамякіна, літаратуразнаўца Т. І. Шамякіна: «Карнач са старонак рамана паўстае, безумоўна, як ідэальны архітэктар. Ён – арыгінальны мысляр, ён кантралюе забудову асобных раёнаў горада і падначальвае яе адзінай эстэтычнай задуме. Ён клапоціцца пра тое, каб кожны будынак, захоўваючы індывідуальнасць, не парушаў цэласны воблік горада (канкрэтны горад у рамане не названы – адзін з беларускіх абласных, магчыма, Магілёў ці Гомель). Здзіўляе комплекс задач, якія прыходзіцца вырашаць герою. Задачы не надуманыя, а вельмі жыццёвыя. Нельга не ўбачыць, што Карнач – сапраўдны Творца, ад Бога: яго цікавіць, так бы мовіць, прырода архітэктурнай прыгажосці, ён імкнецца знайсці сваю універсальную формулу поспеху ў любімай справе. Яго клапаціў, у рэшце рэшт, чалавек – каб чалавеку было добра, утульна, прыемна жыць у доме, у раёне, у горадзе. Уражвае герой і сваёй эрудыцыяй – часта разважае пра творчыя манеры Ле Карбюзье, А. Німейера, Ф. Л. Райта. Трагічная дылема кнігі, на маю думку, заключаецца ў тым, што творчы чалавек, сапраўдны майстар, павінен, вымушаны займацца руцінай – спрачацца з бюракратамі, выбіваць фонды, разменьваць сябе на дробязі. Але Шамякін лічыў падобнае спалучэнне – мастацкага таленту і прабіўных здольнасцяў – неабходнай умовай для поспеху справы і яўна шкадаваў, што такіх людзей, падобных да Карнача, мала ў тагачаснай савецкай рэчаіснасці» [3, с. 65].

Максім Карнач, такім чынам, з'яўляецца дзейным і мэтанакіраваным чалавекам, якога хвалюе аблічча сучаснага горада, асяроддзе, у якім будуць жыць людзі. Галоўнага героя клапоцяць эканамічныя і экалагічныя праблемы, таму ён выступае супраць размяшчэння на тэрыторыі горада хімічнага камбіната, бо гэта будаўніцтва створыць адмоўныя праблемы, найбольшая з якіх – забруджванне ракі. Як галоўны архітэктар Максім Карнач праяўляе бескампраміснасць, паслядоўнасць у адстойванні сваіх пазіцый і поглядаў. Герой рамана – неардынарная, таленавітая асоба, чалавек гуманістычнага мыслення. Пісьменнік у вобразе Карнача стварае характар добрасумленнага спецыяліста, аднаго з сапраўдных прафесіяналаў, высокага сумлення, на якіх трымаецца будучыня дзяржавы. Наогул, раман "Атланты і карыятыды" Івана Шамякіна ў беларускай мастацкай прозе з'яўляецца адным з лепшых сацыяльна-псіхалагічных, інтэлектуальна змястоўных раманаў пра жыццё і прафесійную дзейнасць архітэктараў, які садзейнічае выбару будучай прафесіі, выхаванню патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці, фарміраванню грамадзянскасці, маральнай і эстэтычнай культуры.

Такім чынам, вывучэнне біяграфічнай прозы дапамагае рэалізацыі прынцыпа персаніфікацыі, засваення каштоўнасці самаўдасканалення, пошуку творчага патэнцыялу асобы. Работа з кожным біяграфічным тэкстам прадугледжвае наступныя этапы: пошукі фактараў і стымулаў самаразвіцця, спасціжэнне індывідуальнасці пісьменніка, інжынера, архітэктара праз ключавыя моманты яго лёсу, выбар грамадзянскай пазіцыі і асэнсаванне ролі ў гістарычным працэсе. Такая работа, прадстаўленая ў выглядзе эсэ, рэфератаў, дакладаў, прэзентацый садзейнічае дасягненню мэты выхавання, якая прадугледжвае: фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці; падрыхтоўка да самастойнага жыцця і працы; фарміраванне маральнай, эстэтычнай і экалагічнай культуры; культуры бяспекі жыццядзейнасці; авалоданне ведамі, каштоўнасцямі і навыкамі здаровага ладу жыцця; фарміраванне культуры сямейных адносін; стварэнне ўмоў для актуалізацыі прадпрымальнасці, ініцыятывы, паспяховага самаразвіцця і самарэалізацыі асобы.

**Спіс літаратуры**

1 Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодёжи 2016–2020 годы [Электронный ресурс] : постановление М-ва образования Респ. Беларусь, 15 июля 2015 г. № 82 // ЭТАЛОН. Законодательство Респ. Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2018.

2 Беларуская мова (прафесійная лексіка) : тыпавая вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў / склад. : М. Р. Прыгодзіч, Г. І. Кулеш, Н. П. Лобань ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча. – Мінск : РІВШ, 2008. – 28 с.

3 **Шамякіна, Т. І.** Архітэктура ў жыцці і творчасці І. Шамякіна / Т. І. Шамякіна // Роднае слова. – № 1. – 2004. – С. 62–67.